ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 161 (1128) АЎТОРАК, 15-га ліпеня 1930 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Заключнае слова тав. М. І. КАЛІНІНА

на XVI зьезьдзе УсеКП(б)

Таварышы, зьезд наш скончыў свае работы. Мы падагулілі вынікі дасягненьняў за два з паловінаю гады і вызначылі шляхі для новага прасоўваньня ўперад. (Аплёдысмэнты). Своеасаблівасьць міжнароднай палітычнай абстаноўкі ў даны момант акрэсьліваецца ўзмацненьнем барацьбы працы з капіталам і паглыбленьнем крызысу капіталістычнай гаспадаркі. Гэтыя акалічнасьці ўсё больш і больш узмацняюць у сьвядомасьці самых шырокіх пластоў насельніцтва, не гаворачы ўжо аб пралетарыяце, думку аб тым што капіталізм ня здольны рушыць чалавецтва ўперад, што немінучая пагібель яго сапраўды прадрачона гісторыяй і што ён, капіталізм, перажывае зараз пачатак свайго ўласнага канца. Разам з тым думка гэта, што капіталізм ня здольны рушыць чалавецтва ўперад, у большай ступені абвастраецца пад уплывам тэмпаў будаўніцтва новага жыцьця ў краі дыктатуры пролетарыяту, якое ўсё больш разьвіваецца. Таварышы, іменна ў данай своеасаблівасьці міжнароднай палітычнай абстаноўкі і заключаецца тлумачэньне таго, што да XVI зьезду прыкавана ўвага літаральна ўсяго сьвету. Ворагі нашы шукалі і да гэтага часу яшчэ ня трацяць надзеі знайсьці адзнакі паслабленьня, разгалосься і нарастаючага незадаваленьня сыстэмай пролетарскай дыктатуры.

Прыяцелі нашы, прыгнечаныя клясы ва ўсіх краёх, узіраюцца з надзеяй, прагна ловяць кожную вестку аб малейшым посьпеху ў будаўніцтве соцыялізму, бо яны разумеюць, што гэтыя посьпехі зьяўляюцца іх кроўнымі посьпехамі. Я ня ведаю ці здолелі нашы ворагі заўважыць, зразумець і ацаніць той факт, што XVI зьезд бальшавікоў увесь час быў акружаны шчыльнай сьцяной працоўных мас і вёў сваю работу ў атмасфэры поўнага давер'я, адкрытага спачуваньня і гашучасьці змагацца за поўную перамогу соцыялізму ня толькі з боку рабочае клясы і сялянства, але і з боку перадавой інтэлігенцыі. (Аплёдысмэнты).

Наша партыя зараз, як і заўсёды, моцна спаяна з масамі: задачы партыі блізкі і зразумелы масам. Аб гэтым сьведчаць шматлюдныя дэманстрацыі працоўных ва ўсім краі ў дзень адкрыцьця XVI зьезду і шматлікія прывітаньні, з якімі тут выступалі дэлегаты з розных канцоў Савецкага Саюзу. Таварышы, соцыялістычнае будаўніцтва ў нашым краі атрымала вялізарны размах, але да вялізарных велічынь і тэмпаў у нас прывыклі, яны робяцца звычайнымі. Цяпер нас ужо трудна чым-небудзь зьдзівіць. Усе мы няўдзержна рвемся да лепшага і новага моцнага і магутнага, ад вялікага да грандыёзнага, ад шпаркага да яшчэ больш паскоранага. Яшчэ зусім нядаўна мы захапляліся Волхаўбудам, а цяпер нас не захапляе ўжо Днепрабуд: Учора мы сьвяткавалі адкрыцьце Турксібу і Трактарабуду, а сёньня амаль непрыкметна пачата будаўніцтва камбайных заводаў і мэталюргічных гігантаў—Магнітагорскага, Кузьнецкага і інш. Мы спакойна і ўпэўнена адкідаем у кнізе вялікай соцыялістычнай будоўлі адну старонку за другой, нібы ўсе, што адбываецца так і павінна быць, як быццам нічога асаблівага не адбываецца. У далейшым, бадай, мы прымем, як належнае, і Ангарбуд, і Волгабуд, і Урала-Сібірскі камбінат, і суцэльную калектывізацыю сельскай гаспадаркі ўсяго Савецкага Саюзу. У гэтым, таварышы, выказваецца непахісная ўпэўненасьць у поўнай перамозе соцыялізму. (Аплёдысмэнты).

Але адной упэўненасьці яшчэ мала: трэба дабіцца яшчэ таго, каб ўпэўненасьць гэта апіралася на адпаведную продукцыйнасьць працы. „Продукцыйнасьць працы,—як гаварыў Ленін,—гэта, урэшце, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасьць працы, нябачаную ў часе прыгону. Капіталізм можа быць канчаткова пераможаны і будзе канчаткова пераможаны тым, што соцыялізм створыць новую, значна больш высокую продукцыйнасьць працы. Гэта справа вельмі цяжкая і вельмі доўгая, але яна распачата, вось у чым самае галоўнае“. Так ставіў Ленін пытаньне аб продукцыйнасьці працы. І калі мы даб'емся таго, каб гэту ісьціну цьвёрда ўсьвядомілі рабочыя і калгасьнікі ўсяго Саюзу, тады мы напэўна і безумоўна пераможам. (Аплёдысмэнты).

Таварышы, мы шчыльна падыходзім да соцыялізму. У гэтым выказваецца сусьветна-гістарычнае значэньне посьпехаў, дасягнутых намі за прайшоўшы пэрыяд змаганьня і будаўніцтва.

Але гэта яшчэ не комунізм і нават не соцыялізм, бо,—як паказваў Ленін, „комунізм пачынаецца там, дзе праяўляецца самаадданая, перамагаючая цяжкую працу клапатлівасьць радавых рабочых аб павялічэньні продукцыйнасьці працы, аб ахове кожнага пуда хлеба, вугалю, жалеза і іншых продуктаў, якія дастаюцца і не працуючым асабіста і не іх „блізкім“, а „дальнім“, г. зн. усяму грамадзтву ў цэлым, дзесяткам і сотням мільёнаў людзей, аб'яднаных спачатку ў адну соцыялістычную дзяржаву, а потым у Саюз Савецкіх Рэспублік“. У папярэдні пэрыяд мы бачылі нямала выпадкаў праяўленьня такое клапатлівасьці. Я цьвёрда ўпэўнены, што пасьля 16-га зьезду і на аснове яго пастаноў гэта клапатлівасьць усё больш і больш будзе ахапляць рабочую клясу і ўсіх калгасьнікаў Савецкага Саюзу. (Аплёдысмэнты).

Таварышы! Ворагі савецкай улады—як па-за, так і ўнутры нашага Саюзу—чакалі, калі не расколу, дык, прынамсі, жорсткага змаганьня на 16-м зьезьдзе. Але зноў і зноў яны пралічыліся. Зьезд прадэманстраваў поўнае сваё адзінства і моцную згуртаванасьць вакол ленінскага кіраўніцтва, на чале якога стаіць т. Сталін. (Бурныя доўгія аплёдысмэнты). Ніхто з апазыцыянэраў ня адважыўся выступіць на зьезьдзе супроць вызначанай лініі партыі. Наадварот, мы былі тут сьведкамі капітуляцыі і прызнаньня правільнасьці гэтай лініі з боку былых лідэраў правай опозыцыі. Што датычыць „левага“ ухілу, дык ніхто яго тут не прадстаўляў. Весь час у можна сказаць, што 16 зьезд зьяўляе сабою разгром правага і „левага“ опортунізму. (Аплёдысмэнты).

Аднак, таварышы, гэта зусім ня значыць, што змаганьне на два фронты скончылася. Небясьпека правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі партыі, застаецца незалежна ад паводзін былых лідэраў правага ўхілу. Таксама ў нас яшчэ не ліквідаваны начыста „левыя“ заскокі і прымірэнчыя адносіны да трацкізму. Таму партыя павінна з яшчэ большай непрымірымасьцю і настойлівасьцю весьці ў далейшым змаганьне на два фронты, кіруючыся пры гэтым пастановамі 16 зьезду, якія не пакідаюць ніякіх шчылін для ўхілістых.

Таварышы, цяпер перад партыяй і рабочай клясай адкрываецца пэрыяд далейшага разгорнутага наступленьня соцыялізму па ўсім фронце. Я думаю, што выкажу вашу агульную думку, калі скажу: узброеная ленінскімі пастановамі 16 зьезду, наша партыя, на чале з цэнтральным камітэтам, павядзе рабочую клясу пад сьцягам ленінізму на штурм апошніх рэштак капіталізму ў нашым краі. Я ўпэўнены, што ў рэзультаце апошняга бою мы ператворым Расію нэпаўскую — у Расію соцыялістычную“. (Бурныя аплёдысмэнты).

За пяцігодку ў чатыры гады! (Аплёдысмэнты).

За суцэльную колектывізацыю сельскай гаспадаркі ўсяго Савецкага Саюзу! (Аплёдысмэнты).

Ўпяд да поўнай перамогі соцыялізму! (Бурныя аплёдысмэнты). Усе ўстаюць. Пяюць „Інтэрнацыянал“.

Абвяшчаю XVI зьезд Усесаюзнай Комуністычнай Партыі бальшавікоў закрытым. (З месц раздаюцца воклічы: „Няхай жыве т. Сталін! Ура! Ура!“ Шумныя аплёдысмэнты. Няхай жыве Ленінскі ЦК. (Аплёдысмэнты).

Заметкі са зьезду партыі

Цудоўная сіла

Таварышы запроста называюць яго Серга. Дзелавыя партыйныя якасьці злучыліся ў ім з надзвычайнай прастатой і сумленасьцю.

Серга Орджанікідзе робіць зьезду даклад аб рабоце ЦКК-РСІ. Наркамат утвораны па думцы і волі Уладзімера Ільліча, концэнтруючы ў сабе партыйна-савецкі апарат.

Для буржуазных дзяржаў гэтая рэч нячуваная, для нас яна неабходна.

Размах, тэмп, напор ў рабоце павінен адпавядаць велічыні задачы. Разрыў шкодны, а для нас, для партыі, для савецкай дзяржавы шкодны і небясьпечны асабліва.

Мы бясстрашна заглядвалі ў будучае, апіраючыся на плечы агромністага рэволюцыйнага вопыту партыі ў мінулым. Сучасны ўздым толькі ступень да яшчэ большага ўздыму.

У дакладзе ЦКК на праверцы тры рашаючых вагары. Народная гаспадарка. Савецкі апарат. Партыя.

Знайсьці дадатковыя крыніцы і рэсурсы ў першым выпадку, перадаць, ачысьціць, арабочыць—у другім, узмацніць баявую якасьць адзінства, дысцыпліну, разбурыць опортунізм—трэцім.

Здабыць нафту замест 26 мільён. тон—40, сталі замест 5 мільён тон—7, павялічыць програму чыгуна да 17 міл. тон, захаваць дзяржаве сотні мільёнаў руб. перабудовы свайго флёту, пераглядзець у бок павялічэньня програму засеву бавоўны і г. д. і г. д. Гэта зроблена.

Усё гэта коратка называецца барацьбой супроць недаацэнкі магчымасьцяй.

776 заводаў краіны шэфствуюць над органамі савапарату. Чысьцяць, палепшаюць, перабудоўваюць. Вучаць іншых, вучацца самі. Шэфства два гады назад—прыклад аднаго, двух заводаў, цяпер гэта вагар агромністай сілы.

Першыя вынікі чысткі савецкага апарату. У выніку экономія сотзн мільёнаў рублёў. На месцы дзесяткаў тысяч вычышчаных чыноўнікаў, шкоднікаў, бюрократаў,—дзесяткі вылучэнцаў з заводаў. Усё гэта разам узятае барацьба за рэволюцыйныя органы ўлады, простыя, танныя, блізкія працоўным.

Гэта барацьба мела посьпехі.

Партыя, яе адзінства, зьдзінасьць—у цэнтры ўвагі. Узмацніць боездольнасьць яе шэрагаў, як наступальныя якасьці, узмацніць вопыт мінулага, памножаны на вялічэзную работу сучаснага. Перабудаваць яе рады на хаду, ачысьціць і адсячы троцкістых і ўсякую шваль, змагацца з правымі опортуністымі, стрымаць заскакваючых уперад, узмацніць няўстойлівых, выхаваць сотні тысяч новых маладых.

Вынік падсумавала ня толькі партыя. Вынік падсумавала і рабочая кляса. Гэта не партыя. Замест няўстойлівых, вышаўшых, выкінутых, яна паслала ў шэрагі партыі 600 тысяч новых пролетараў.

Такі баланс. Ён у нашу карысьць, а цудоўная сіла, у чым яна?

Аб ёй сказаў сам дакладчык.

„Тут можа быць пастаўлена такое пытаньне: чорт вас дзяры, якімі цудоўнымі сіламі вы ўладаеце, што як куды ні пойдзеце, зараз-жа павялічваеце програму. Ніякімі асаблівамі сіламі мы не ўладаем, таварышы. Уладаем адданымі, сумленнымі комуністымі і некалькімі спэцыялістым, у тым ліку і замежнымі працаўнікамі. Мабыць, уся перавага нашых абсьледваньняў у тым, што ў асяродзьдзі нашых абсьледвацеляў пакуль-што шкоднікаў няма“.

Якая сіла дапамагла перамагчы гэтую вялізарнейшую работу? Цудоўная сіла заключана ў самой партыі і ў рабочай клясе, рэволюцыйнай да канца.

В. С.



22 чэрвеня адбыўся ў Гамбурзе баявы дзень рэволюцыйных палітзьняволеных, організаваны компартыяй сумесна з іншымі рэволюцыйнымі організацыямі.

У дэмонстрацыі ўдзельнічала некалькі дзесяткаў тысяч рабочых, работніц і рабочай моладзі.

На здымку: Дэмонстранты на шляху да месца мітынгу.

На плякаце: «Дапамажэце ахвярам поліцэйскага тэрору і буржуазнай клясавай юстыцыі. Змагайцеся за вызваленьне пролетарскіх вязьняў».

Баявая задача патрабуе баявых тэмпаў

ЦК КП(б)Б, даючы дырэктыву партыйным організацыям аб разгортваньні падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, ставіць гэта пытаньне, як кардынальнейшую баявую задачу КП(б)Б і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

Але мы, выходзячы з матар'ялу аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі на мясцох, прымушаны констатаваць, што справа падрыхтоўкі па шэрагу акруг Віцебскай, Гомельскай знаходзяць пад простай пагрозай зрыву.

У шэрагу месц замест разгортваньня політыка-масавай працы і забесьпячэньня добраякаснага ходу падрыхтоўкі да ўборкі, установы і комсамольскія камітэты займаюцца толькі вынясеньнем прыгожых рэзолюцый і пісаньнем нікаму непатрэбных цыркуляраў.

Праца-ж па падрыхтоўцы ўборачнага інвэнтара, яго рамонт і забесьпячэньне імі колгасаў належна не вядзецца. Па шэрагу колгасаў з-за адсутнасьці запасных частак да ўборачных машын і організацыі належнай працы, рамонт машын сарваны і колгасы, маючы ў дастатковай колькасьці ўборачных машын, ня змогуць іх выкарыстаць.

Паасобныя колгасы Гомельшчыны і іншых акруг ужо часткова прыступілі да практычнай працы да ўборкі ўраджаю. Але матар'ял з месц сьведчыць, што ўборка з-за адсутнасьці належнай падрыхтоўкі праходзіць незадавальняюча, адсутнічае ўлік і расстаноўка працоўнай сілы, не разгорнута ўдарніцтва і соцспаборніцтва, маецца шэраг унутраных непаладак з-за недакладнай пастаноўкі організацыйнай працы.

Адсутнічаюць пляны працы, не працуюць вытворчыя нарады, колгасьнікі ня ведаюць сталых задач уборачнай працы перад колгасам, слаба выкарыстоўваецца практыка старых колгасьнікаў, колгасьнікі ня ведаюць як будзе аплачвацца іх праца і г. д.

Асобныя правыя опортуністыя, стаячы на чале кіраўніцтва колгасамі тыпу Кась'янавых з Камарынскага колгассаюзу (Гомельскай акругі) справу ўмацаваньня колгасаў і правядзеньня уборачнай кампаніі здаюць на самацёк, мотывуючы непатрэбнасьць падрыхтоўкі „таму, што колгасы ўсё роўна неўсойлівыя“ (?). І гэты опортуністы не атрымлівае рашучага адпору з боку партыйна-комсамольскіх організацый, а адсутнічаньне належнай падрыхтоўкі да уборкі ў іншых раёнах сьведчыць аб тым, што кой-дзе яшчэ моюцца опортуністы тыпу Касьянавых, якія сваімі дзеяньнямі дапамагаюць кулацтву зрываць організаваную ўборку ў колгасах.

Комсамольская організацыя вёскі, ячэй і колгасаў, саўгасаў і сельсаветаў не зрабілі ў сябе яшчэ у сваёй рабоце патрэбнага пералому ў працы у бок да найлепшай організацыі уборачнай кампаніі.

Пытаньнямі рамонту інвэнтару, расстаноўкай і організацыяй працоўнай сілы, наладжваньнем і організацыяй працы па ўдарніцтву і соцспаборніцтву займаюцца толькі нека орыя ячэйкі і комсамольскія камітэты. Не атрымліваючы пакуль адпору з боку партыйна-комсамольскіх організацый, выкарыстоўваючы непадрыхтаванасьць асобных колгасаў да уборкі ўраджаю і адсутнічаньне належнай масавай працы—кулацтва разгарнула шалёную працу па зрыву ўборкі асабліва ў колгасах, у выніку мы маем у паасобных мясцох, дзе больш слабыя колгасы, факты выхаду з колгасаў асобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па Гомельскай і Віцебскай акругах.

Усё гэта ставіць з усёй рашучасьцю перад комсамольскай організацыяй задачу:

Комсамольскія організацыі абавязаны выкарыстаць абвешчаны „Чырвонай Зьменай“ ўсебеларускі налёт „ЛК“ па праверцы падрыхтаванасьці устаноў да уборачнай кампаніі. З мэтай рашучай барацьбы з опортуністычнымі адносінамі і бюрократычнай нярухомай работай па падрыхтоўцы і правядзеньню уборкі.

Паставіць у цэнтры увагі працы комсамольскіх ячэек правядзеньне рашучага змаганьня з кулацкай агітацыяй супроць колгасаў, вядучы працу сярод беднацка-серадняцкага сялянства і колгасьнікаў у напрамку арганізацыі і для рашучай барацьбы з кулацкай агітацыяй і поўнага выкананьня задач уборачнай кампаніі.

Практычная работа працы ячэек павінна быць накіравана на організацыю ў колгасах і совгасах брыгад для выкананьня асобных прац, поўны ўлік працоўнай сілы і дакладнае яе размеркаваньне, ахоп ударніцтвам і спаборніцтвам усіх колгасаў і колгасьнікаў. Разгортваньне шырокай масавай працы, растлумачэньне задач уборачнай кампаніі, організацыя з комсамольцаў колгасьнікаў і неколгасьнікаў брыгад па дапамозе колгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам ў правядзеньні ўборачнай кампаніі. Організацыя брыгад па рамонту ўборачнага інвэнтара, яго праверкі, дагляду, яго нагрузкі працай, разгортваньне барацьбы за падняцьце вытворчасьці працы працоўнай дысцыпліны і барацьбы з лжэўдарніцтвам.

Трэба памятаць кожнай комсамольскай ячэйцы і комсамольцу, што пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі залежыць не ад „траскучых“ рэзолюцый, а ад жывой справы,—правільнай організацыі работы па ўборачнай кампаніі, рашучай барацьбы з правым опортунізмам, „левымі“ крыкунамі і кулацтвам.

Посьпех уборкі—посьпех далейшага росту соцыялізму ў краіне.

Не аказёньваць самаправеркі

Кіраўніцтва колектыву ЛКСМБ заводу імя Ланцуцкага не мобілізавала комсамольскія масы для ажыцьцяўленьня зад[...] самаправеркі. Некаторыя райкомы на Віцебшчыне да самаправеркі аднесьліся формальна. АК ЛКСМБ абмежаваўся тол[...] рассылкай дырэктыў

МОБІЛІЗАЦЫЯ ШЫРОКІХ МАС КОМСАМОЛЬЦАЎ І ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ НА ПРАКТЫЧНАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЗАДАЧ ПАРТЫІ—ВОСЬ АСНОВА САМАПРАВ[...] І ПЕРАБУДОВЫ САЮЗНАЙ РАБОТЫ

Ударыць па шкодных тэндэнцыях.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек комсамолу па Тураўскаму раёну (Мазыршчына) праходзіць слабымі тэмпамі. Папярэднія весткі аб абмеркаваньні гэтага пытаньня на бюро райкому сьведчаць, **што ў некаторых ячэйках ёсьць тэндэнцыя збыць з плеч перавыбары і адчапіцца ад іх, як ад чарговай кампаніі.** Соцспаборніцтва паміж ячэйкамі ў час перавыбараў не разгорнута. Аб узаемным абсьледаваньні ячэйкі ячэйкай толькі гаварылася. Таму ў асноўным трэба канстатаваць, што маса комсамольцаў ня ўцягнута ў перавыбары, а аб беспартыйнай моладзі і гаварыць нават ня прыходзіцца, аб гэтым гаворыць наступны факт: сакратар Рычаўскай ячэйкі Рай імкнуўся праводзіць справаздачна-перавыбарчы сход так, што ня толькі беспартыйная моладзь, але і ня ўсе комсамольцы ведалі аб сходзе.

Ячэйка налічвае 11 комсамольцаў, з іх чалавек 5 у колгасе. У ячэйцы назіраліся правыя настроі. Комсамолец Староўскі настойваў на тым, каб прынялі ў колгас кулака Чарнушэвіча, гаворачы, што ён „добры гаспадар“. Кандыдат комсамолу Маўзэр Раіса упарта супраціўляецца ў правядзеньні беларусізацыі. З сялянамі гаворыць толькі на расійскай мове, тлумачачы, што ўсё роўна яны ня гутараць на беларускай мове. На такіх вылазках ячэйка не давала руйнуючага адпору.

Я. Сандамірскі.

Самакрытыка зьяўляецца толькі гасьцём

Пашыраны пленум Койданаўскага РК ЛКСМБ, прысьвечаны пытаньню самаправеркі організацыі, констатаваў, што самакрытыка ў організацыі зьяўляецца гасьцём, дзякуючы чаму ў організацыі ёсьць шмат хібаў. **Пастановы ЦК УсеЛКСМ і пленуму ЦК ЛКСМБ аб становішчы Беларускай організацыі не даведзены да шырокіх колаў комсамольскіх мас.** Тэмпы працы організацыі не адпавядаюць тэмпам будаўніцтва.

У справе колектывізацыі некаторыя ячэйкі займаліся толькі агітацыяй за колгасы, а практычна нічога не рабілі. Напрыклад, Негарэльская сельсавецкая ячэйка мае ў сваіх шэрагах 37 комсамольцаў, а колгасьнікаў толькі 6, Байдацкая з 15 чалавек комсамольцаў у колгасе мае толькі трох чалавек. Зусім невыстарчальная работа праводзіцца з беспарт. працоўнай моладзьдзю, у першую чаргу з батрачкамі і бядняцкай. Ячэйка колгасу «Новае Жыцьцё» у гэтым кірунку палец аб палец ня ўдарыла. Ячэйка комуны імя Сталіна займалася склокамі, п'янствам, бойкамі, замест дзелавой работы сярод мас працоўнай моладзі.

Трохмесячнік беларускай пролетарскай і нацменаўскай культуры, які цяпер праводзіцца, не ўскалыхнуў організацыю да ўзмацненьня ўдзелу ў культурна-нацыянальным будаўніцтве. Тэзісы да 16 зьезду УсеКП(б) прапрацаваны ня ўсімі ячэйкамі. Ня лепшае становішча з прапрацоўкай пастаноў 16 зьезду КП(б)Б

Самаправерка павінна прайсьці пад знакам ліквідацыі недахопаў і ажыўленьня работы ва ўсіх зьвеньнях організацыі.

Макарэвіч.

Опортуністычныя памылкі, аб якіх сыгналізавала „Ч. З.“, ня выпраўлены

У час перавыбараў бюро сельсавецкай ячэйкі мястэчка Лагойск (Меншчына) выявілася, што ячэйка не займалася асноўнымі пытаньнямі работы комсамолу. Соцыялістычнае спаборніцтва ячэйка абышла і гэтым пытаньнем зусім не займалася. Ячэйка ня ўдзельнічала ў лесазагатоўках.

У той час, калі комсамольская організацыя раёну абвясьціла паход за організацыю працы ў колгасах, комсамольская ячэйка ў гэтым кірунку нічога не зрабіла. Ячэйка яшчэ не падумала аб сілосаваньні, нават не правяла і растлумачальнай работы, у той час, калі некаторыя сяляне колгасьнікі не разумеюць, што такое сілосаваньне

Артыкул, зьмешчаны ад 18 красавіка ў „Ч. З.“ аб права-опортуністычных памылках у ячэйцы, разьбіраўся на агульным сходзе ячэйкі. Факты падцьвердзіліся, прыняты прапановы, але яны да сёняшняга дню ляжаць у сакратара ячэйкі і памылкі ня выпраўлены. Работа з батрацтвам не вядзецца. Экономпрацаўнік ячэйкі ня ведае, колькі ёсьць у яе ваколіцах батракоў. Новаму бюро трэба забясьпечыць неадкладнае выпраўленьне політычных памылак ў рабоце ячэйкі. Юнкор Э.



МАСЫ НЕ МОБІЛІЗАВАНЫ

У комсамольскім колектыве заводу імя Ланцуцкага (Гомель) самаправеркай ня была ахоплена трохсоценная комсамольская організацыя такога буйнага заводу, на якім працуе больш 500 чалавек рабочай моладзі.

Грымеў оркестр у пустым памяшканьні

Перавыбарчыя сходы цэхавых ячэек з прычыны непадрыхтаванасьці прышлося пераносіць з аднаго тэрміну на другі, бо толькі за два дні да перавыбараў пачалі працаваць камісіі па праверцы работы ячэек. На перавыбарных сходах прысутнічала ня больш 50 проц. комсамольцаў. Папярэдняя праверка работы бюро колектыву комсамольцамі была пастаўлена вельмі дрэнна. Цікава, што вывады аб рабоце камісіі па праверцы бюро рабіў другі работнік бюро колектыву, бо з сяброў камісіі на конфэрэнцыі нікога ня было.

Замест 102 дэлегатаў на заводзкай конфэрэнцыі комсамолу прысутнічала ўсяго толькі 48 чалавек. Аб комсамольцах не дэлегатах і гаварыць няма чаго. **Гэта гаворыць аб якасьці падрыхтоўкі з боку бюро колектыву да заводзкай конфэрэнцыі.** Работу конфэрэнцыя пачала на 2 гадзіны пазьней вызначанага тэрміну. Гэта паказвае аб расхлябанасьці, недысцыплінаванасьці і ў першую чаргу самога активу, які павін н быць прыкладам для радавых комсамольцаў. Кожны лічыў сваім абавязкам гаварыць аб слабай дысцыплінаванасьці комсамольцаў і ў той жа самы час гэта яму не перашкаджала быць самому недысцыплінаваным сябрам саюзу.

За тое ўрачыстасьцю конфэрэнцыя была багата. Хоць мяз людзей, урачыстасьць—рапарты, прывітаньні, доказныя прамовы, сяброў прэзыдыуму, бурныя воплескі, якія для пасіленьня гуку пераходзілі ў стуканьне кулакамі па сталох, грамавы шум оркестру, так што рэзонанс пустога памяшканьня не даваў магчымасьці чуць саміх прамоўцаў. Штучная ўрачыстасьць нешта не гармануе з недысцыплінаванасьцю. За ўрачыстасьцю гублялася дзелавая работа.

Спадзяваньне на „самацечны энтузіязм“

Тыя таварышы, якія сур'ёзна аднесьліся да сваёй задачы, у спрэчках паказалі, што колектыў у асноўным здаровы, што ён, пасьля прарываў у першым квартале, змагаўся за выкананьне прамфінпляну, што ён даваў адпор праваўхілісцкім настроям часткі комсамольцаў.

Але колектыў у масе сваёй зрабіў толькі яшчэ першыя крокі ў выкананьні лёзунгу—тварам да вытворчасьці. На паперы ўсе комсамольцы ўдарнікі, а на справе гэтага няма. Ёсьць ілжэ-ўдарнікі (ФЗВ), ёсьць прагулы (кавальны цэх), нежаданьне падпісаць соцдагавор (мэханічны цэх) і г. д. **Ячэйкі не кіравалі ўдарнымі брыгадамі, спадзяваліся на „самацечны энтузіязм“, асабліва ў кавальным цэху.** Колектыў не ваяваў за даведзеньне прамфінпляну да кожнага рабочага і варштату. Прамфінплян нават не даведзен на сёньняшні дзень да цэху.


Грымелі оркестры, але ня было каму слухаць

Удар па шкодных, праваўхілісцкіх настроях, якія былі і ёсьць у частцы комсамольцаў, ня быў скарыстаны, як выхаваўчы ўрок для ўсяго колектыву. Опортуністага Вараб'ёва выключылі, а колектыў аб гэтым ня ведаў, і комсамольцы думалі, што ён і зараз комсамолец. Такое габінэтнае выключэньне, такая барацьба з праваўхілісцкімі настроямі, не дасягае сваёй мэты.

Комсамольцы маўчаць

Сапраўднай комсамольскай крытыкі ў колектыве няма. „Лёгкая кавалерыя“ спала, а калі выявіла адну справу, то завком яе спакойна палажыў пад сукно і „кавалерыстыя“ гэтым засталіся задаволены. У друкаванай заводзкай газэце „Цягнік соцыялізму“ комсамольцы ня ўдзельнічаюць. На проф. і парт. сходах маўчаць, а яшчэ лепш зусім іх не наведваюць. Аб дрэнным рамонце с-г. машын, якія былі на заводзе ў зімовы час, комсамольцы ні слова. **Колектыў лічыў, мусіць, не патрэбным падняць свой голас протэсту супроць шкодніцтва, экономічнай контррэволюцыі на 9 вучастку службы цягі, аб чым загаварыў увесь Гомель.**

Нядарма рабочыя пытаюцца: „Чаму нешта ня чуваць нашых комсамольцаў“.

У колектыве не ў пашане вывучэньня ленінскае тэорыі. Зімовая політвучоба фактычна сарвалася. Выпісваемыя газэты чытаюцца слаба. **Актыў завучвае голыя дэвізы, фра[зы] — і толькі. Глыбокае вучэньне марксызму—ленінізму ад[сутн]ічае. Адгэтуль паніжаецца клясавая боездольнасьць комсамольцаў.**

Пасіўнае супраціўленьне беларусізацыі

У справе беларусізацыі колектыў нічога не зрабіў. Работа ячэек вядзецца на расійскай мове. На конфэрэнцыі толькі паасобныя таварышы выступалі на беларускай мове. **Гурток, які складзены для актыву па вывучэньню беларускай мовы, распаўся. Пасіўнае супраціўленьне беларусізацыі п[ануе ў] колектыве. Адгэтуль пасіленьне надзяржаўных настрояў сярод комсамольцаў. Комсамолец Жыткоўскі заявіў: „у політшколу не пайду, паеду ў Расію, дзе мне не патрэбна будзе вывучаць беларускую мову“.**

Бюро колектыву на гэта ра[... н]е рэагавала.

Зразумела, што ўсе недахопы, былі падкрэсьлены на конфэрэнцыі, залежаць ня толькі ад кепскага кіраўніцтва з боку бюро комсамольскага колектыву, але і ад дрэннага кіраўніцтва комсамольскім колектывам з боку партыйнай організацыі. Парт'ячэйкі ведаюць становішча комсамольскіх ячэек і не дапамагаюць ім у рабоце. Вось адзін толькі маленькі прыклад: с[акра]тар парт'ячэйкі кавальнага цэху ня ведае, хто зьяўляецца сакратаром комсамольскай ячэйкі. Спадзяемся, што пастаноўкай парткіраўніцтва комсамолам на заводзе Ланцуцкага зацікавіцца Сталінскі райком партыі.

Брыгадзір „Ч. З.“ В. Ва[...]

Гомель.

У савгасе ячэйка не адчуваецца

У савгасе Вясёлава (Барысаўшчына) ячэйка складаецца з 18 комсамольцаў. У савгасе ёсьць шмат беспартыйнай моладзі, сярод якой ячэйка зусім не працуе. З ваколічных вёсак, дзе [...] ш ат колгаснай моладзі, у комсамол уцягнуты адзін чалавек. Таму і адкова, што самі комсамольцы [...] адносяцца да ячэйкі. Намечаны [...]кай суботнік для дапамогі бедн[...] севе праваліўся. Бюро ячэйкі ні[...] не правярала політычную пі[сьме]насьць комсамольцаў і не кі[равала] гэтым вучасткам. Соцспаборніцтва [не] стала мэтадам работы ячэйкі. [...] ячэйка слаба кіруе комсамольскай ячэйкай. Такое становішча комсамольскай ячэйкі зьяўляецца нецярпімым тым больш што яна знаходзіцца ў буйным малочным саўгасе, які [за]гоўвае горад малочнымі прадуктамі. А ў саўгасе для ячэйкі—вялікае [поле] дзейнасьці.

В. Мэбе[...]

ПРАРЫВЫ, ЯКІХ НЯ БАЧЫЦЬ КІРАЎНІЦТВА

Самаправерка па Віцебскай організацыі пачалася з 1 чэрвеня г. г., але яна да гэтага часу ня прыняла патрэбнага размаху. Комсамольскія організацыі поўнасьцю не ўсьвядомілі політычнай важнасьці самаправеркі, таму апошняя праводзіцца бяз шырокага ўдзелу комсамольскіх мас.

АК ЛКСМБ толькі склікаў нараду сакратароў РК і колектываў і даў пісьмовыя дырэктывы. Праверкай выкананьня дырэктыў АК не займаўся і пытаньня аб ходзе самаправеркі ня ставіў.

Райкомы да самаправеркі аднесьліся формальна, заняліся толькі перапячаткай дырэктыў АК і рассылкай ячэйкам, ня ўтвораны ўдарныя брыгады для кіраўніцтва і дапамогі ў самаправерцы.

Паказаньні па правядзеньню самаправеркі слаба распрацаваны як активам, так і ўсёй комсамольскай масай, гэта не дало магчымасьці ўзварушыць комсамольскую масу на барацьбу з прарывамі ў організацыі.

У чым жа сутнасьць прарываў? Надта марудна адбываецца паварот комсамольскай організацыі тварам да вытворчасьці на буйнейшых фабрыках і заводах Віцебску: Завод с-гаспадарчых прылад „Чырвоны Мэталіст“, швейная фабрыка „Профінтэрн“, абутковая фабрыка „Лекерта“ і інш.

Буйнейшыя колектывы ЛКСМБ не змаглі мобілізаваць комсамольскую масу і моладзь вакол пытаньня зьніжэньня сабекошту, палепшаньне якасьці і павялічэньне колькасьці выпрацоўкі і г. д.

Другі Віцебскі РК ЛКСМБ не рэагаваў на бязьдзейнасьць колектыву „Чырвонага Мэталіста“. Некаторыя комсамольцы ў першым паўгодзьдзі няўважліва адносіліся да вытворчасьці, займаліся рвацтвам, і зразумела, чаму прамфінплян выканан толькі на 86,7 проц., чаму зьнізіўся сабекошт на 6,7 проц. Такое становішча прывяло да распаду бюро колектыву. Новы склад бюро зрабіў некаторы паварот ў рабоце. Утвораны ўдарныя брыгады ў плужным цэху і ліцейным, якія выканалі плянавае заданьне [на] 135 проц. і зьніжан сабекошт [на] 13,1 проц. Але ва ўдарных б[рыга]дах удзельнічаюць ня ўсе [комса]мольцы. У мэханічным цэху 42 комсамольцы і няма ў[дарнай] брыгады. Сакратар колектыву [...]дзін тлумачыць „з прычыны [таго,] што адбываецца рэконструкцыя [цэ]ху, таму немагчыма ўдарніча[ць і] спаборнічаць“.

Пастанова ЦК ЛКСМБ аб [бела]рускай організацыі, паст[анова] студзеньскага пленуму КП(б)Б не распрацаваны [колек]тывамі „Чырвоны Мэтал[іст]“, «Профінтэрн ІІІ». Прадз[ьезд]скія дыскусійныя матар[ыялы не] абмяркоўваліся. Колектывы [не] рэагавалі на выступленьні [клясава-во]лацкіх агэнтаў у парты[йным] друку (артыкул Мамаева [...]. Са]макрытыка і крытыка не [раз]горнута, што не дало м[агчы]масьці сваячасова выкрыць [гэ]тыя хваробы.

Брыгадзір „Ч. З.“

ЛУК'ЯНО[...]

ЗРАБІЦЬ РАШУЧЫ ПАВАРОТ ТВАРАМ ДА УБОРКІ

Шэраг арганізацый ЛКСМБ не пераключыўся на ўдарнае правядзеньне падрыхтоўкі да уборкі ўраджаю, а галавацяпы з гомельскага і чашніцкага палявод і колгассаюзаў зрываюць уборку

Абвясьцім жорсткую вайну сьпячцы, чарапашшым тэмпам, бюрократызму, дэмобілізацыйным і „самацечным“ настроям

У Чашніках не зразумелі палітычнай важнасьці ўборачнай кампаніі

Шэраг устаноў у гэтым кірунку бязьдзейнічае

Для ўсіх бясспрэчна вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне надыходзячай уборачнай кампаніі, у якую ўступяць упяршыню, колектыўна зьбіраць ураджай большасьць колгасаў. Таму усе сілы і ўвага павінны быць сконцэнтраваны на гэтай важнейшай задачы.

Але ня так абстаіць справа ў Чашніцкім раёне.

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі па раёну фактычна сарвана. Ужо шмат якія колгасы распачалі ўборку (комуна „Чырвоны Барацьбіт“ сабрала каля 40 га сенажаці). А райвыканком толькі 9 ліпеня зацьвердзіў плян правядзеньня ўборачнай асеньняй пасеўкампаніі па раёну, які не раней, як 15 ліпеня дойдзе да сельсаветаў і колгасаў і да 20 мяркуюць давесьці да індывідуальнага сэктару.

З 20 колгасаў раёну ніводны ня мае ў сябе плянаў альбо працоўнай програмы ўборачнай кампаніі, не праведзена вучоту і разьмеркаваньня працоўнай сілы і па большасьці колгасаў не організаваны брыгады.

Шмат колгасаў пачынаюць ўборачную кампанію пры недахопе працоўнай сілы. На адну працоўную адзінку будзе прыходзіцца ўборкі ад 6 да 14 гэктараў (комуна „Чырвоны Барацьбіт“, „Палац Працы“ і колгас імя Сталіна і іншыя).

Пэўна, што без падрыхтоўкі справіцца з работаю будзе ў такім разе вельмі цяжка. Але ніхто ў падрыхтоўцы колгасам не дапамагае, нават райвыканком, замест таго, каб выкарыстаць аграномаў на дапамогу колгасам у складаньні плянаў уборачнай кампаніі, адпусьціў іх у адпачынак.

Рамонт машын сарвалі

Рамонту ўборачных сельска-гаспадарчых машын ў раёне не распачалі. Шмат у якіх колгасах (комуна „Чырвоны Барацьбіт“, „Палац Працы“, „Новае Жыцьцё“ і інш.), якія маюць жняяркі і касілкі, патрэбна рабіць рамонт. бо няма некаторых запасных частак (шасьцернік і інш.). Але рамонту няма.

Райколгассаюз і райвыканком ведаюць пра такое становішча, але ніхто з іх ня прыняў патрэбных мер, каб папярэдзіць пагрозу зрыву працы па рамонту с.-г. інвэнтару. Райколгассаюз нават ня вызначыў у сябе адказнага за організацыю работы па рамонту с.-г. інвэнтару ў колгасах.

„Хлеба няма і ня рыхтуемся“

Нічога ня робіцца ў падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі і па лініі чашніцкай спаж. коопэрацыі. Праўленьне яшчэ ня вызначыла перад сабой мерапрыемстваў па дапамозе колгасам у наладжваньні грамадзкага харчаваньня на час уборачнай кампаніі, а таксама не падрыхтавала асобных тавараў, як колёсная мазі і інш.

Трэба адзначыць, што кіраўніцтва коопэрацыі наогул безадказна адносіцца да справы падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Аб гэтым яскрава сьведчыць хаця-б такі факт: калі ў старшыні праўленьня Нікалаева запыталі, што яны робяць па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, ён адказвае—„хлеба няма і мы не рыхтуемся“.

„Мне некалі рыхтавацца“

Ня лепей абстаіць справа з падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі і па лініі камітэтаў узаемадапамогі. Ні раёны, ні сельскія камітэты не правялі адпаведнай падрыхтоўчай работы да ўборачнай кампаніі. Селькамітэты не разгарнулі работу ў кірунку дапамогі індывідуальным бядняцкім гаспадаркам, удовам і сем'ям чырвонаармейцаў па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Старшыня-ж райкамітэту ўзаемадапамогі тлумачыць гэта тым, што яму працаваць некалі, бо райвыканком пасылае яго па сваіх справах.

Нічога ня робяць у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі і профсаюзы. Толькі саюз Савгандслужачых 9 ліпеня на сваім перавыбарчым сходзе заслухаў даклад аб задачах уборачнай кампаніі.

Комсамол бяздзейнічае, а лжэ-ўдарнікі рываюць работу

Амаль-што не закранула падрыхтоўчая работа да ўборачнай кампаніі большасьць комсамольскіх ячэек. З 20 ячэек раёну ёсьць толькі адзінкі, якія правялі некаторую падрыхтоўчую работу. Ніводная з комсамольскіх ячэек як колгасаў, так і сельсавецкіх ня вызначылі перад сабой конкрэтных мерапрыемстваў на ўдзелу ва ўборачнай кампаніі, не праведзена ніякай масавай работы, не распачалі работы па організацыі ў колгасах брыгад, ударніцтва і соцыялістычнага спаборніцтва.

Нават ёсьць шмат фактаў зрыву працоўнай дысцыпліны і ня толькі сярод беспартыйных, але і комсамольцаў.

Так, комсамолец Міцько Зьмітрок Прыстойскай ячэйкі кінуў работу на конях і пайшоў лавіць рыбу. Комсамолец Дварэцкай ячэйкі Бабаедаў, скончыўшы курсы па сілосаваньню, адмовіўся ад работы, заяўляючы: „Я павінен толькі кіраваць, а не працаваць“. Тры ўдарнікі з Беляковскага аддзяленьня, Дварэцкага Куста (Беляковскі і інш.) ня вышлі на работу і г. д.

Есьць шмат фактаў дэзэртырства комсамольцаў і беспартыйнай моладзі з колгасу ў той час, калі колгасы адчуваюць вялікі недахоп у працоўнай сіле.

На ўсіх гэтых адмоўных фактах удзелу КСМ у рабоце колгасаў, комсамольскае кіраўніцтва не змагло мобілізаваць увагі шырокіх колаў комсамольцаў і ня прыняло практычных крокаў змаганьня з ілжэўдарніцтвам, за сапраўднае разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва.

Нарэшце, трэба адзначыць, што партыйны камітэт і парт'ячэйкі на мясцох ня прынялі даволі энэргічных мер для забесьпячэньня пасьпяховай работы падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Бюро райкому партыі ўжо каля месяца, як разглядала гэта пытаньне, але да апошняга часу не праверыла, што зроблена ў раёне адпаведнымі ўстановамі і організацыямі.

Клясавы вораг ня сьпіць

Адсутнасьць шырокай масавай работы сярод колгасаў і колгасьнікаў па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі дало магчымасьць кулацкім элемэнтам актывізаваць сваю работу ў барацьбе з колгасамі, не атрымліваючы падчас рашучага адпору з боку партыйных і комсамольскіх ячэек.

Выкарыстаўшы непадрыхтаванасьць колгасаў да ўборкі, кулакі запугваюць колгасьнікаў, пры наяўнасьці ў паасобных колгасах недахопу працоўнай сілы, непамерна вялікай працай, нізкай аплатай працы і г. д., што прывяло ў паасобных мясцох да выхаду асобных гаспадарак з колгасаў.

Усё гэта ставіць з усёй сур'ёзнасьцю перад партыйна-комсамольскай організацыяй задачу зрабіць рашучы пералом у бок паляпшэньня і паскарэньня тэмпу працы па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі. Для гэтага трэба мобілізаваць усе сілы і сродкі для рашучай барацьбы з кулацтвам, якое імкнецца сарваць уборку ўраджаю ў колгасах і з усімі тымі, хто сваім бязьдзейнічаньнем дапамагае клясаваму ворагу ў барацьбе супроць партыі і колгасаў.

К. Д.

Як яны рыхтуюцца да ўборкі ўраджаю



РКСТУ: „Мне некалі рыхтавацца—ганяюць... райвыканком“



Спажыв. коопэрацыя: „Хлеба няма і я ня рыхтуюся“

МЭТЫ І ЗАДАЧЫ АДНЫ, А ДАГАВАРЫЦЦА НЯ МОГУЦЬ

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі на Гомельшчыне праходзіць вельмі марудна. Акруговая газэта „Палеская Праўда“ чамусьці лічыць непатрэбным ўсю сваю крытыку накіраваць супроць абломаўшчыны акруговых устаноў, у якіх дзе-ні-дзе ўжо адчуваецца дэмобілізацыйны настрой у сувязі з іх ліквідацыяй.

„Інструкцыю разаслалі і што яшчэ?

Факты будуць гаварыць самі за сябе.

Плян уборачнай кампаніі да колгасу і вёскі не даведзен, шмат спэцыялістых, мобілізаваных для гэтай справы на вёску, да гэтага часу ня выехалі. Акрколгассаюз організацыяй працы ў колгасах ня цікавіцца.

Аграком—організатар акрколгассаюзу так і заявіў: „Мы сваё зрабілі—інструкцыю Белколгасцэнтру разаслалі на месца і што яшчэ“? Вось вам і разуменьне сваіх задач—інструкцыю разаслаў і на гэтым паставіў кропку. Пры такой выключна цыркулярнай організацыі працы мы ніколі сапраўднай організацыі працы ня ўбачым.

У гэтым годзе па колгасах Гомельшчыны патрэбна будзе убраць 35 т. га ўраджаю.

Акрколгассаюз асабліва павінен цікавіцца, як ідзе завоз і рамонт уборачных машын.

Па пляну машынамі трэба будзе убраць 23 тысячы га, ручным спосабам 12 т. га. Ёсьць ў колгасах старых машын 227, вызначана для завозу новых 222. Прадстаўнікі колгассаюзу не пацікавіліся, як Сельгасспаб завозіць машыны і ці будуць яны своечасова на месцы.

„Дыплёматычныя“ перагаворы зрываюць рамонт машын

Большасьць раёнаў машын не атрымалі, а там, дзе атрымалі (Рэчыцкі р.), не хапае некаторых частак да прысланых машын.

Яшчэ горш абстаіць справа з рамонтам старых машын. Тут проста пагражаючае становішча. Заводы імя Лапцуцкага, „Рухавік Рэволюцыі“ і „Пролетары“ па аўтарытэтнай заяве тых-жа працаўнікоў акрколгассаюзу завалены машынамі, але іх ніхто не рамантуе. Заводы катэгорычна ад р а м о н т у адмаўляюцца, мотывуючы гэта непрыстасаванасьцю іх да гэтай справы.

Але тут справа ня ў гэтым.

Пры жаданьні іх можна прыстасаваць вельмі хутка. У зімовы час завод Лапцуцкага праводзіў рамонт трактараў, за які (рамонт) прышлося чырванець ўсёй пролетарскай грамадзкасьці. Такім чынам з-за сваёй няўдбайнасьці нарабілі глупства і таму зараз баяцца, каб гэтага не паўтарыць. У сучасны момант паміж акрвыканкомам і заводамі вядуцца „дыплёматычныя“ перагаворы, хто з апошніх павінен усё-ж такі ўзяць на сябе справу рамонту сельска-гаспадарчых машын.

Няўжо таварышы не зразумелі, што цяпер ня час „таргавацца“, а што зараз трэба як мага хутчэй прыступіць да справы, бо ўборка на носе.

Па гэтаму пытаньню цэнтр павінен зрабіць самыя рашучыя захады.

Ударыць па цьвёрдалобасьці кіраўнікоў Лесбелу і дарожнага аддзелу

За час уборачнай кампаніі трэба скарыстаць усе магчымыя рэсурсы цягавай і трактарнай сілы. Гэта бясспрэчна, але вось пайдзі і пагавары з працаўнікамі гомельскага дарожнага аддзелу, у якога ёсьць 12 нескарыстоўваемых трактараў сыстэмы „Фордзон“, пайдзі пагавары з прадстаўнікамі гомельскага лесбелу, у якога трактары стаяць і ржавеюць. Яны адкажуць вельмі «далікатна»: „трактары дамо, але прывядзеце нам ў двор узамен коняй і людзей“.

Спадзяемся, што на цьвёрдалобых зробіць уплыў адпаведная дырэктыва РСІ.

Пляны склалі, штаб абралі, а работушка ў магіле

Плян сілосаваньня кармоў пры існуючых тэмпах ня будзе выкананы і на палавіну. Напрыклад, у Брагінскім раёне падрыхтоўку да сілосаваньня мяркуюць праводзіць пасьля ўборачнай кампаніі. Інакш намесьнік старшыні РВК і ня думае. У час двухтыднёвіку па сілосаваньню комсамол Гомельшчыны не ўзварушыўся, таму, што акругком комсамолу даў пісьмовыя дырэктывы, склаў штабную тройку (усё па штабному!?) і на гэтым заснуў. Курсы па сілосаваньню, якія былі намечаны для правядзеньня ў кожным раёне (за выключэньнем 3-4) не адбыліся.

Скарыстаць вопыт комсамольцаў „Рухавіка Рэволюцыі“

Гарадзкая комсамольская організацыя да падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і асабліва да справы сілосаваньня не прыцягнута. Хоць і ёсьць ячэйкі (праўда, паасобныя), якія не чакаючы дырэктыў, самі ўзяліся за справу. Напрыклад, комсамольская ячэйка заводу „Рухавік Рэволюцыі“ ўзяла на сябе ініцыятыву і пабудавала сілосарэзку (коштам у 1000 руб.) і накіравала яе ў падшэфную «дняпроўскую комуну».

Ячэйка КСМ Сельмашбуду не вядзе барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Норма „15 сілосарэзак у дзень“—ня выконваецца. Паасобныя рабочыя гэтага заводу ў пагоні за выпрацоўкай забываюць аб якасьці сваёй продукцыі і выпускаюць сілосарэзкі нікуды нявартыя.

Гомельскаму акруговаму камітэту комсамолу трэба праявіць больш рухавасьці, трэба больш стала кіраваць комсамольскай організацыяй ў справе падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Брыгадзір «Ч. З.» **Воінаў.**

Там, дзе „спачываюць“ на лаўрах

* Па Сьмілавіцкаму раёну (Меншчына) адвод сенажаці колгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам яшчэ не закончаны. Сельсаветы і камітэты сялянскай узаемадапамогі яшчэ не падумалі аб аказаньні дапамогі індывідуальным бядняцкім гаспадаркам. Рамонт сельска-гаспадарчых машын яшчэ не закончан. Сьпяць сельсаветы, сьпяць партыйныя і комсамольскія ячэйкі.

Каліна.

* Колгас „Новыя Фаліцы“ (Старадароскага раёну, Бабруйшчына) яшчэ не распачаў падрыхтоўчую работу да ўборкі і асеньняй сяўбы. Колгас будзе адчуваць востры недахоп у рабочай і цягавай сіле, а райколгассаюз і комсамольская ячэйка Нова-Дароскага сельсавету і не падумалі аб аказаньні дапамогі апошняму.

Сулімчук.

800-кілёмэтравы прабег стальных коняй

Мы везьлі рапарты аб наступленьні соцыялізму па ўсіх франтох.

...Дванаццаць разоў была перададзена з рук у рукі гэтая невялічкая істужка чырвані з надпісам „Менск—Масква". На ўсіх дванаццаці этапах яе адчапілі з адных запацеўшых і змораных плеч і ветла і асьцярожна прышывалі да другіх.

Яна ўбачыла тысячы твараў і сотні вёсак.

Яна ўбачыла пыл і пясок непраезджых закінутых дарог.

Яна перажыла разам з намі пакуту дажджоў і холад вячэрніх ветраў.

Але самае галоўнае тое, што яна была, злаецца, найбольш супакойнай сьведкай тых сустрэч, калі хваляваліся нашы сэрцы, калі сумкі капіталаў станавіліся цяжэйшымі, а маўклівыя коміны фабрык ласкава махалі нам,— хусікамі чорнага дыму.

I вось цяпер, калі шлях гэты скончан і калі мы ўвайшлі цэрамоніяльным маршам на стадыён „Дынамо", дзе віталі нас пяцьдзесят тысяч пролетарыяў Масквы, і калі дванаццаць лепшых эстафэтчыкаў перадалі 16 зьезду баявыя рапарты краіны,— зараз можна падвесьці вынікі, схамінуцца ад калейдоскопу ўражаньняў і ўспомніць усё тое, з чым мы ішлі праз цяжкасьці і няпрыгоды, праз радасьці і крыўды, ад польскіх граніц Негарэлага, ад Менску да Масквы— сталіцы сусьветнага пролетарыяту.

1. Дарога

Выдатная дата. Дваццаць восьмае— дванаццаць гадзін. Над намі схіліліся старая шэрая вежа на плошчы Волі і гадзіньнік, які зусёды раўнадушна бомкае поўны лік разоў.

А мы нэрвуем! Оркестр ужо гучыць разьвітальны марш, шофэры завод яць машыны і капітан Карповіч (ударнік, завод „Комунар"—Менск) прывязвае да сьпіны сумк, з рапартамі, сумку рамалёваную залатымі літарамі — БССР!

Мы выходзім у далёкі паход у шэры і пахмурны дзень. Сонца няма. Хмары абліма але неба і злаецца, што няўмуча па дарозе танкавыя ігла дажджу прабіюць і сумку і сьпіны велёсыпэдыстых, якія ня суша ў адных толькі трусах.

Мы разьвінаемся з Менскам ля магутных колён—брамы сельска-гаспадарчай выстаўкі. Вобляск шкляных сьцен іх доўга яшчэ мігаціць у вачох. Бэтонамяшалкі, дарожныя машыны, як гігантскія чарапахі, скрыгаюць паветру і не даюць нам ні гучымасьці пераехаць.

Мы злазім і прабіраемся пешша. Глыбы пераверпутай зямлі ідуць на нас наступам. Першыя няпрыгоды дарогі мы пачалі адчуваць ужо, як толькі выехаўшы за Менск.

I вось 30 вёрст гэткага немагчымага шляху. Пяскі і разлогі, вузенькія сьцежкі і раўніны гразі. За тое, кры-да дарогі на першай астаноўцы зьімаецца асалодай сустрэч.

Мы ў Смалявічах. На „Фордзе" наладжваецца мітынг. Прыходзяць піонэры, вучні, комсамольцы, колгасьнікі. Гавораць прадстаўнікі раённых організацый. Гаворыць Траскоўскі ад імя вышэйшага савету фізкультуры.

У Барысаў мы прыяжджаем адвячоркам. Шлях Смалявічы — Барысаў трохі лепшы і гэтую адлегласьць мы праходзім разам з „Фордам" якраз у вызначаны тэрмін.

Барысаў дадае новыя рапарты—і ў сумцы капітану іх ужо становіцца звыш дзесятку.

Ноч на перагоне Барысаў—Крупкі мы праводзім у вёсцы Лошніцы.

Днём мы ў Крупках. Яшчэ раз некалькі гадзін у мяст. Талочын. Тут зноў невялічкі мітынг, даручэньне завесьці рапарт і ўрачыстыя провады.

Праз паўгадзіны за Толочынам мотоцыкль „Дынамо" Б. А., на якім у калысцы еду я, на поўным ходзе пападае ў канаву.

Шофэр ЦымаНоўскі вылятае з сядла і робіць сальдо праз руль і пярэднюю кола. Мы абудвы кляне праеждыя фурманкі. Гэта яны вінаўнікі аварыі.

Справа ў тым, што па дарозе, на якой мы едзем, увесь час пападаюцца фурманкі. Яны ні разу ня бачылі, ні аўто, ні мотоцыклу. Яны бязьлітасна рвуць на сябе аброю, кідаюцца на нас, кідаюцца ў бакі, у канавы, і тут трэба мець вялікую здольнасьць, каб праехаць каля гэтых бунтоўных жывёлін. Да некаторай ступені гэта зьяўляецца паказчыкам, наколькі яшчэ слаба наша вёска бачыць аўто.

2. Асінбуд—зьезд!

Мы пад'яжджалі да Воршы. За некалькі хвілін да гораду мы ўбачылі лёгкае драцянае павуціньне.

Гэта быў дрот Асінбуду—яго мядзяныя жылы, па якіх ён будзе дасылаць сваю электрычную кроў ускоднім частцы Савецкай Беларусі. Дрот павольна ляжаў на высокіх слупах і ледзьве гойдаўся ад ягевалічкага ветрыку.

У гэтых грацыёзных ажурных слупох і ў гэтым танкавым дроце мы ўбачылі моц Асінбуду—першай у БССР раённай станцыі імя Сталіна, першага беларускага электрагіганта.

Праз колькі хвілін у Воршы на вялікай масавай гуляніцы, наладжанай у гонар прыезду эстафэты, мы атрымалі рапарт Асінбуду.

Ён быў кароткі і сьцісл. У ім гаслася, што галоўны корпус ужо гатовы на 88 проц., што мантажныя работы закончаны на 47 проц., што будаўніцтва падстанцыі ў Віцебску, Воршы, Магілеве і Дуброўне закончаны і што Асінбуду зьяўляецца наймагутнейшым ўдарнам па прагыя ныцках і трусох. У ім пісалася, што рабочыя, тэхнікі і інжынэры Сталінскай станцыі адныя з галоўных падмуркаў індустр ялізацыі БССР і перетварэньня жабрацкай у магутную Беларусь,—у соцыялістычную БССР цяпер, усе сілы сваё, усю энэргію і жаданьне накіроўваюць на тое, каб скончыць Асінбуд у тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам.

У Воршы мы атрымалі рапарт і ад імя пра зільнага комбінату—аднаго з вялікіх адзінак нашай пяцігодкі.

Комбінат рапартаваў зьезду, што першы год ягонна а ўдаўніцтва сконічаны з поспехам, што ён рабоў і ласа так, каб мець магчымасьць адразу скарыстаць першую энэргію Асінбуду. Рабочыя і інжынэры комбінату пісалі, што яны зьяўляюцца яскравымі сьведкамі і непасрэднымі ўдзельнікамі тэй рэконструкцыі народнай гаспадаркі БССР, якую пачынае ўжо праводзіць Асінбуд.

I калі мы паслая Воршы прыехалі ў Дуброўну, мы ўбачылі гэта самі. Мы ўбачылі ў Дуброўне адну з асінбудаўскіх падстанцый. Рабочыя Дуброўны сустрэлі нас уночы. Яны ўзялі нас начаваць у свае кватэры, а раніцою перадалі нам рапарты зьезду. 1092 ткачы „Дняпроўскай Мануфактуры" заяўлялі зьезду, што прарыў за першае паўгодзьдзе цяпер імі ліквідуецца, што за першыя два месяцы трэцяга кварталу прамфінплян ужо выкананы на 90 проц., што на фабрыцы ёсьць 42 вытворчых комуны, якія аз'ядналі 117 чалавек і якія даюць перавыкананьне прамфінпляну.

Праз пяцьдзесят кілёмэтраў у мястэчку Лядах колгасьнікі лядзянскадуброўенскага аграрна-індустрыяльнага колгасу-комбінату перадалі нам свой рапарт. Гэта быў таксама будучы пітомец Асінбуду—гэта быў наглядны паказчык рэконструкцыі, якую ўносіць Асінбуд. Комбінат пісаў, што ў вясною 1929 году ён меў усяго толь і 10 колгасаў на плошчы 1364 га, а вясною 1930 году—26 колгасаў на плошчы 4452 га. Плян сяўбы перавыканан на 19 проц. Колгасьнікі расказвалі аб гэроічных прыкладах, якія яны паказалі пры выкананьні сяўбы. Комбінат засеяў усе бросавыя землі, усе кулацкія вучасткі. Комбінат значна дапамог індывідуальнаму сэктару справіцца з сваімі пасевамі.

Зараз колгасьнікі комбінату будуюць два цагляных заводы: адзін чарапічна-ільняны завод, электрычную падстанцыю, гараж, механічныя рамонтныя майстэрні, хлявы і клюбы. Зараз колгасьнікі праходзяць курсы палявода, жывёлавода, трактарыстых, рахункавода, курсы чыгуннай справы, агракурсы, курсы колгаснага актыву і г. д.

Так будуецца соцыялізм

У сумку, перапоўненую рапартамі аб перамогах, аб наступленьні соцыялізму па ўсіх фронтах мы везьлі да зьезду. I кожная з нашых сумак, кожнага маршруту, ці будзе гэта Архангельск—Масква, або Сьвярдлоўск—Масква, ці Тыфліс—Масква, ці Менск—Масква,—усе яны прывезеныя з няблывалым энтузіязмам праз непраежджыя дарогі, праз рэкі, праз дажджы, праз холад і вецер, усе яны могуць быць найлепшай ілюстрацыяй да лазу Сталіна, ято думкі, аб наступленьні соцыялізму на ўсіх франтох—задача, якая паўстала перад нам і. Так, сапраўды мы везьлі рапарты аб тым, што наступленьне соцыялізму ідзе па ўсіх франтох.

I так вось праходзіў наш мар рут. Аднагасова трэцяга ліпеня ў Маскву прышлі эстафэты Тыфлісу, Архангельску, Уралу і Беларусі,—эстафэты Асінбудаў, Сельмашбудаў, капальняў, колгасаў, фабрык і комбінатаў.

Змораныя мы ўяжджалі ў Маскву. Нас было на стадыёне каля 1000 чал.

6-га ліпеня мы прайшлі цэрамоніяльны м маршам перад зьездам.

Ішоў дож ж. Стадыён быў заліты вадою. Наверсе на зьездаўскай трыбуне стаяў разам з усім зьездам Сталін, Кагановіч.

Зьезд сустракаў апладысмэнтамі колёны фізкультурнікаў.

I так рапарты дастаўлены ў Маскву —рапарты аб наступленьні соцыялізму.

А. Каліта.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў МЕНСКУЮ АБ'ЯДНАНУЮ ПРОФТЭХШКОЛУ

Профтэхшкола мае сваёй мэтай за 2-гадовы тэрмін навучаньня падрыхтаваць кваліфікаваную рабочую сілу і маладыя кадры завод. пэрсоналу ніжэйшагадачаных спэцыяльнасьцяй, а таксама даць сярэднюю тэхнічную адукацыю.

Вучні профтэхшколы праходзяць заводзкую практыку, у час вакацый і па сканчэньні школы адразу пасылаюцца на заводзкую работу.

Профтэхшкольцы, жадаючыя працягваць сваю адукацыю ў вышэйшых тэхнічных навучальных установах праз два гады заводзкай практыкі пастаупаюць без іспытаў у адзначаныя ўстановы.

У наступным навучальным годзе пры школе адчыняецца аўтомахінічнае аддзяленьне.

Школа забясьпечвае вучняў стыпэндыяй на 60 проц., інтэрнатамі на 60 проц.

Заявы будуць прымацца да 1-га жніўня. Заявы падаюцца на імя прыёмнай камісіі аб'яднанай профтэхшколы.

Да заявы далучаюцца наступныя дакументы:

а) Дакумант ад узросьце (мэтрыка);

б) Дакумант аб асьвеце;

в) 2 фотографічныя карткі;

г) Медычнае пасьведчаньне аб здароўі;

д) дакумант, які сьведчыць аб соцыяльным і матэр'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў насьля рэволюцыі;

е) Давелка, засьведчаная пізавой Савецкай організацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў;

ж) для сялян акладны ліст, альбо засьведчаная копія яго па сельска-гаспадарчаму падатку на 1929-1930 г., а для самаўпраўнікаў адпаведны дакумант аб падатку на 1929-30 г.;

з) анкета з сьведчаная профсаюзнымі, альбо савецкімі організацыямі.

Увага. 1. Ніякія копіі дакумантаў ня прымаюцца.

2. У заяве трэба паказаць, на якім аддзяленьні і сэкцыі паступаючы жадае вучыцца.

3. Да заявы трэба прыкласьці паштовыя маркі на 25 кап. для адказу.

Узрост паступаючага ў аб'яднаную профтэхшколу павінен быць не ніжэй поўных 14 год на 1-е жніўня 1930 г. і не вышэй 18 г.

У профшколу прымаюцца асобы, якія скончылі поўны курс 7-гадовай школы незалежна ад году сканчэньня без іспытаў, альбо адпаведныя гэтаму курсу іншыя нав. установы.

Пры менскай аб'яднанай профтэхшколе існуюць 2 аддзяленьні: а) мэталёапрацоўчае, дрэваапрацоўчае і 2 сэкцыі: а) беларуская і б) яўрэйская.

Курс профшколы разьлічаны на 2 гады.

Псыхотэхнічны і медычны агляд адбудзецца з 1-га па 10-е жніўня. Паведамленьне аб выніках прыёму— з 15-га па 20-е жніўня.

Перавага пры прыёме даецца дзецям рабочых адпаведных спецыяльнасьцяў.

Загадчык аб'яднанай профтэхшколы Сьвірыдовіч.



НА ФОТО: ручная і машынная набіўка запалак на запалачнай фабрыцы „Пролетарская перамога" ў Нова-Барысаве.

За мяжою

Поліцыя абараняе штрэйкбрэхераў

Крывавая сутычка паміж рэволюцыйнымі рабочымі і поліцыяй

БЭРЛІН, 10. Учора ўночы на вуліцах Эйсьлебену адбылася жорсткая вулічная сутычка між чырвонымі забастовачнымі пікетамі і штрэйкбрэхерамі. Поліцыя выступіла на абарону штрэйкбрэхераў і пачала страляць у бастуючых гарнякоў. Пазьней, калі штрэйкбрэхеры выходзілі з копяй, абкружаныя моцнымі поліцэйскімі атрадамі, забастовачныя пікеты і сабраўшыяся з усіх бакоў рабочыя сталі абсыпаць поліцыю і штрэйкбрэхераў каменьнямі. Поліцыя накінулася на рабочых і пачала страляць у адчыненыя вокны рабочых кв. Страляніна цягнулася да 2 гадзін. ночы.

На наступны дзень рабочыя арганізавалі масавую дэмонстрацыю, якая з разгорнутымі сьцягамі шла па вуліцах Эйсьлебену. Дэмонстрацыя паказала, **што прамая поліцыйная тактыка поліцыі да амога штрэйкбрэхераў толькі ўмацоўвае баявы настрой бастуючых гарнякоў.**

Галадоўка палітзьняволеных ў Орадэа Мэры

ВЕНА, 8. Арыштаваныя ў лютым у сувязі з комунальнымі выбарамі ў Орадэа-Мары (Румынія) мясцовыя работнікі компартыі абвясьцілі тыдні два таму назад галадоўку. Ня гледзячы на тое, што суд неаднакроць даваў параджэньне аб іх вызваленьні, прокурор кожны раз адмяняў пастанову суда і трымаў зьняволеных у турме ў самых цяжкіх умовах.

Адзін з зьняволеных — Попа-Марын, адмаўляючы суп, прынесены назіральнікам, незнарок заліў яму руку і за гэта быў пакараны двухтыднёвым карцэрам. Калі яго захацелі кіраваць у карцэр, Попа-Марын аказаў супраціўленьне. Назіральнікі накінуліся з пабоямі. Астатнія пасьля зьняволеныя надзвычайна рыліся, узбунтаваліся, пачалі кідаць у назіральнікаў чым папала і сталі ламаць дзьверы камэры. Выклікалі варце толькі з вялікімі намаганьнямі ўдалася падавіць бунт.

На наступны дзень у тэрміновым парадку ся абгавараньнем становішча зьняволеных і парашыў... ліць восем членаў компартыі і трох комсамольцаў.

Рэформісты пацярпелі паражэньне

ПАРЫЖ, 10. Пасьля трохдзённых работ закончыўся зьезд унітарнага (рэволюцыйнага) профсаюзу рабочых дзяржаўных прадпрыемстваў (арсеналаў, ваенных заводаў і г. д.). Незначная рэформісцкая меншасьць, якая імкнулася навязаць саюзу рэформісцкія мэтады барацьбы, пацярпела паражэньне. Зьезд прыняў пастанову аб тым, каб рабочыя, аб'яднаныя профсаюзамі, былі прадстаўлены на кангрэс Профінтэрну. Зьезд таксама аднагалосна прывітаў тэлеграму 16-му зьезду УсеКП(б).

Францыя „разбройваецца"

БЭРЛІН, 12. Газэта „Дыпляматыш Політышэ Корэспондэнт" абгаварвае прапановы Брыяна ў сьвеце францускіх узбраеньняў. Газэта адзначае, што ваенныя выдаткі Францыі ў 1930 г. дасягаюць у 21 мільярд франкаў, 7 разоў больш адпаведных выдаткаў Нямеччыны.

„Няхай жыве Савецкі Саюз, няхай жыве Комінтэрн"

ВЕНА, 12. У Будапэшце пры зачыненых дзьвярох абвешчан прыгавор падсудным з першай групы па працэсу „106" комуністых. 11 чалавек прыгавораны да розных тэрмінаў турэмнага зьняволеньня. Астатнія падсудныя, якія сядзелі у папярэднім зьняволеньні, апраўданы. Падсудныя спаткалі прыгавор выкрыкамі: „Няхай жыве Савецкі Саюз, няхай жыве Комінтэрн".

Адказны рэдактар Рэдкалегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 59...